**УДК 94(476)«1912/1917»**

# СТВАРЭННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ МАГІЛЁЎСКАГА ЦЭНТРАЛЬНАГА ТАВАРЫСТВА ЦВЯРОЗАСЦІ (1912–1917)

*Мяньчэня С. В.*
Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт
Мінск, Беларусь

**Анатацыя.** *Магілёўскае цэнтральнае таварыства цвярозасці было створана ў 1912 г. для пашырэння ідэй цвярозасці, культурна-асветніцкай дзейнасці, нагляду за нелегальным продажам алкаголю і барацьбы з рэвалюцыйным рухам. Шмат у чым гэтая дзейнасць супадала з дзейнасцю Папячыцельстваў аб народнай цвярозасці. Таварыства стварыла бясплатную чытальню, некалькі кіёскаў для продажу праўрадавых газет, праводзіла рэлігійныя святы, народныя чытанні і святы цвярозасці.*

**Ключавыя словы:** *таварыствы цвярозасці; Магілёўскае Богаяўленскае брацтва; праваслаўная царква; «прымусовая цвярозасць».*

# THE CREATION AND ACTIVITIES OF THE MOGILEV CENTRAL SOBRIETY SOCIETY (1912–1917)

*Menchenya S. V.*
Belarusian State Agrarian Technical University
Minsk, Belarus

**Abstract.** *The Mogilev Central Society of Sobriety was established in 1912 to spread the ideas of sobriety, cultural and educational activities, supervise the illegal sale of alcohol and combat the revolutionary movement. In many ways, this activity coincided with the activities of the Trustees of National Sobriety. The society created a free reading room, several kiosks for selling pro-government newspapers, held religious holidays, national readings and sobriety holidays.*

**Keywords:** *sobriety societies; Mogilev Epiphany Brotherhood; Orthodox Church; «forced sobriety».*

Афіцыйныя таварыствы цвярозасці на тэрыторыі беларускіх губерняў пачалі ствараціца напрыканцы XIX ст. Яны характарызуюцца невялікай колькасцю членаў і, у пераважнай большасці, непрацяглым часам існавання. Росту колькасці таварыстваў спрыяла пастанова Свяшчэннага Сінода ад 12 чэрвеня 1909 г. з праектам аб запрашэнні духавенства да барацьбы з народным п’янствам. Тут прадугледжваліся наступныя меры: арганізацыя таварыстваў цвярозасці, брацтваў, царкоўных са-

ветаў, пропаведзі супраць п'янства, абавязковыя для ўсіх святароў, у семінарыях планавалася стварыць асобны аддзел з антыалкагольнай літаратурай у бібліятэках [1]. На 1 студзеня 1911 г. на пяць беларускіх губерняў прыходзілася 31 зарэгістраванае таварыства цвярозасці, куды ўваходзіла каля 1400 чал. Найменшая колькасць іх прыходзілася на Магілёўскую губерню – 3 таварыствы і каля 86 чал. [2].

Актыўны дзеяч цвярозага руху Гомельскі епіскап і вікарый Магілёўскі Мітрафан прапанаваў ідэю стварэння цэнтралізаванай сістэмы таварыстваў цвярозасці. У 1911 г. пад патранажам царкоўна-праваслаўнага Багаяўленскага брацтва былі створаны таварыствы цвярозасці на станцыі Буда-Кашалёўская, мястэчку Свержын (Рагачоўскі павет), вёсцы Чарацянка (Гомельскі павет) [3, с. 2]. У ліпені 1912 г. па ініцыятыве Мітрафана ў якасці аддзялення брацтва пачаўся працэс афармлення Магілёўскага цэнтральнага таварыства цвярозасці. Аднак прызначэнне Мітрафана ў лістападзе 1912 г. на пасаду Мінскага епіскапа не дазволіла яму завяршыць гэту справу. Рэальная дзейнасць таварыства распачалася толькі восенню 1913 г. пад кіраўніцтвам новага Гомельскага епіскапа Варлаама і пры падтрымцы Магілёўскага епіскапа Канстанціна. Аднак у некаторых публікацыях кіраўніцтва таварыствам прыпісваюць Канстанціну.

24 верасня 1913 г. быў зацверджаны Статут таварыства. Галоўнай задачай абвяшчалася барацьба з п'янствам і разбэшчваннем народа. Сярод кірункаў дзейнасці адзначаліся: публічныя чытанні, стварэнне «лятучых атрадаў» хрысціян-агітатараў, выданне і продаж антыалкагольнай літаратуры, арганізацыя народных чайных, чытальняў і бібліятэк, нагляд за нелегальным продажам алкагольных напояў [4, с. 290–291]. Трэба адзначыць, што падобныя функцыі выконвала і мясцовае Папячыцельства аб народнай цвярозасці, дзейнасць якога, аднак, на той час фактычна прыпынілася. Папячыцельства выступала з ідэяй памеранага спажывання алкаголю і было не вельмі ўдалай формай грамадска-дзяржаўнага супрацоўніцтва [5, с. 129]. Прадугледжваліся тры формы членства: «действительные» члены – давалі зарок абсалютнай цвярозасці; спаборнікі – асобы, якія спачувалі ідэям цвярозасці; кандыдаты – асобы, якія жадалі пазбавіцца ад звычкі спажываць алкаголь, і непаўналетнія. Для першых двух катэгорый уводзіліся членскія ўзносы у памеры 50 кап. за год з магчымасцю зніжэння сумы ці вызвалення ад выплаты для бедных. Удзел у таварыстве быў магчымы як пры ўмове абсалютнай цвярозасці, так і пры зароку на пэўны тэрмін. Таварыства распрацоўвала тыповы статут для прыхадскіх таварыстваў

цвярозасці, якія маглі дзейнічаць як самастойна, так і ў якасці філіялаў цэнтральнага таварыства [43, с. 292–296]. Члены прыхадскіх таварыстваў давалі зарок не спажываць алкаголь самім і не частаваць іншых, сачыць за нелегальным продажам алкаголю і паведамляць аб такіх выпадках уладам, дапамагаць, у тым ліку матэрыяльна, бедным членам таварыства [6, с. 329–330].

Напярэдадні гэтай падзеі – 22 верасня 1913 г. – таварыства ўрачыста адкрыла «Прытулак цвярозасці» ў Братскім Богаяўленскім манастыры Магілёва. Памяшканне прытулку складалася з двух пакояў, у першым з якіх месцілася бібліятэка, а ў другім – чытальны стол з газетамі. Меліся тут і антыалкагольныя выданні на продаж. Прытулак працаваў штодзённа, доступ да літаратуры і перыядычных выданняў быў свабодным [7, с. 619–620]. У першыя дні наведвальнікаў у прытулку было няшмат, здараліся выпадкі непаразумення: прытулак, па сутнасці, быў чытальняй, але назва суадносіла яго з месцам адпачынку. Да канца першага месяца дзейнасці прытулак штодзень наведвалі 30–40 чал., а прыбытак ад продажу літаратуры склаў прыкладна 9 руб. [8, с. 695–696]. Для наведвальнікаў быў наладжаны продаж гарбаты па 2 кап. за шклянку. Для чытальні было вырашана аформіць падпіску на перыядычныя выданні «Нива», «Родина», «Светочъ», «Родина», «Дружеские Речи», «Новое Время», «Свет», «Земщина», «Рассвет», а таксама спецыялізаваныя выданні, прысвечаныя пытанню цвярозасці «Отдых Христианина», «Трезвая Жизнь», «Вестник Трезвости» и «К свету». З 6 снежня з прытулку пачаў працу газетны кіёск, які спецыялізаваўся на продажы выданняў «национально-патриотического содержания» («Дружеские Речи», «Новое Время», «Свет», «Земщина», «Колокол», «Русская копейка»). Гэтае рашэнне было аргументавана тым, што знайсці падобныя выданні ў горадзе цяжка, бо большасць кіёскаў прадае газеты «левага» кірунку. Для супрацьдзеяння «шкодным» рэвалюцыйным ідэям планавалася арганізаваць яшчэ тры кіёскі ў розных раёнах горада. Напрыканцы года ў продажы з'явіліся календары на духоўную, патрыятычную і сельскагаспадарчую тэматыку [9, с. 720–721].

4 лістапада 1913 г. на сустрэчы з епіскапам Канстанцінам кіраўніцтва таварыства цвярозасці падтрымала ідэю правядзення народных чытанняў. Для інтэлігенцыі на багаслоўскую тэматыку – за плату (ад 5 да 50 кап.), для простага люду на маральна-этычную і пазнавальную тэматыку з выкарыстаннем «туманных карцін» – без платы. Для народных чытанняў былі абраны тры пляцоўкі – Народны дом Папячыцельства

аб народнай цвярозасці (раён Лупалава), мужчынская гімназія і першае прыхадское вучылішча [9, с. 708]. Першае багаслоўскае чытанне прайшло 21 лістапада і дало 80 руб. чыстага прыбытку [9, с. 720].

У снежні 1913 г. і лютым 1914 г. таварыства зладзіла ў Магілёве літаратурна-асветніцкія вечары цвярозасці. Падчас першага мерапрыемства адбыўся выступ епіскапа Варлаама, затым а. Ц. Казлоўскі даў справаздачу аб дзейнасці таварыства, усё гэта суправаджалася выступленнем хору і дэкларацыяй вершаў на тэму цвярозасці навучэнцамі семінарыі і свецкіх устаноў горада [10, с. 94–95].

4 мая 1914 г. у Магілёве было арганізавана Свята цвярозасці. Яно распачалося з малебна, затым адбыўся хросны ход з удзелам епіскапа Канстанціна, вышэйшых духоўных чыноў епархіі, губернатара і віцэ-губернатара, навучэнцаў. Хросны ход распачаўся ад Брацкага манастыра і прайшоў па маршруце Дняпроўскі праспект – Губернатарская плошча – Вялікая Садовая – Афіцэрская вуліца – Дняпроўскі праспект – Кафедральны сабор. Свята суправаджалася зборам ахвяраванняў на карысць таварыства (80 руб. прыбытку). У Народным доме прайшлі гутаркі аб шкодзе алкаголю [11, с. 279–280].

У той жа дзень епіскап Варлаам прыняў удзел у аналагічным свяце ў Гомелі. Цэнтральнай яго падзеяй было ўрачыстае адкрыццё Гомельскага таварыства цвярозасці. У склад таварыства ўвайшлі 22 асобы, у тым ліку прадвадзіцель дваранства М. Лаўрыноўскі, старшыня земскай управы А. Мухартаў, камандзір 160-га пяхотнага палка М. Лівенцаў з жонкай і інш. Тут таксама можна правесці паралелі з папячыцельствам аб народнай цвярозасці, кіраўніцтва якога складалася з мясцовых чыноўнікаў на чале з прадвадзіцелем дваранства. Спецыяльна да свята А. Лівенцава вырабіла сцяг цвярозасці з белага шоўку з залацістым пазументам. З аднаго боку сцяга мелася выява Спаса з надпісам «Не упивайтеся вином», з другога – Георгій Пабеданосец і надпіс «Блажен, иже претерпит искушение» [12, с. 346].

З пачаткам Першай сусветнай вайны ў Расійскай імперыі адбыліся значныя змены. 23 жніўня 1914 г. было абвешчана, што продаж моцных напояў забараняецца да канца ваеннага часу, а 20 верасня 1914 г. Мікалай II афіцыйна абвясціў аб тым, што продаж гарэлкі вырашана спыніць назаўжды [13, с. 3]. У артыкуле «Переживаемый нами великий исторический момент» «Могилёвских епархиальных ведомостей» адзначаліся змены, якія адбыліся ў грамадстве пад уплывам «прымусовай цвярозасці»: змяншэнне правапарушэнняў, узроўню спажывання алкаголю. У гэтым бачыўся залог перамогі: «Трезвое население это именно то,

что нужно, что само по себе является великим моральным, санитарным и материальным приобретением минувших дней. Оно, это население, трудолюбивое, спокойное и стойкое... Пусть не нарушает его спокойствия водка» [14, с. 506]. Аднак актуальнасць асветніцкай дзейнасці і пашырэння ідэй цвярозасці не знікла. Новай праблемай стаў продаж алкагольных сурагатаў, у першую чаргу «ханжы» (часцей за ўсё разведзены дэнатуратны спірт).

У 1915 г. таварыства працягнула правядзенне чытанняў, распаўсюджванне праўрадавай прэсы, а таксама правяло шэраг акцый. 19 і 26 мая ў Магілёве адбыўся збор сродкаў на справу цвярозасці. Акцыя 19 мая суправаджалася хросным ходам, у якім удзельнічала каля 4 тыс. чалавек. У храмах адбывалася раздача рэгілійна-маральных ліcткоў, а па горадзе прадавалі жэтоны з выявай голуба як сімвала маральнай чысціні [15, с. 136–137].

21 чэрвеня было арганізавана паломніцтва да Палыкавіцкай крыніцы (сёння – помнік прыроды рэспубліканскага значэння, Магілёўскі раён). Так таварыства вырашыла пракантраляваць паводзіны шматлюднага паломніцкага натоўпу (да 10 тыс. чал.), які звычайна ў гэты дзень займаўся «народным разгулом». Перад прысутнымі выступіў епіскап Варлаам, быў праведзены абрад асвячэння крыніцы. 29 жніўня епіскап Канстанцін узначаліў урачыстыя мерапрыемствы Свята цвярозасці ў Магілёве, а епіскап Варлаам – у Баркалабаўскім манастыры [15, с. 137].

Аднак паступова дзейнасць таварыства цвярозасці скарачалася. У 1916 г. «Магілёўскія епархіяльныя ведамасці» нічога не ўзгадваюць пра яго. Прычынай таго была змена прыярытэтаў: Богаяўленскае брацтва засярodзілася на дабрачыннай дзейнасці і дапамозе параненым.

Магілёўскае цэнтральнае таварыства цвярозасці праіснавала непрацяглы перыяд, яно павінна было стаць кіруючым цэнтрам цвярозага руху ў Магілёўскай губерні і выконваць тыя функцыі, што раней ускладаліся на папячыцельствы аб народнай цвярозасці, аднак, у адрозненне ад апошніх, кіравалася не свецкімі асобамі, а царкоўнымі іерархамі, а яго дзейнасць мела выразны рэлігійны характар. На жаль, «Магілёўскія епархіяльныя ведамасці» не публікавалі поўны спіс удзельнікаў таварыства, але на прыкладзе яго Гомельскага філіяла можна меркаваць аб іх падабенстве з папячыцельствамі. Пры гэтым таварыства займала выразную палітычную пазіцыю – падтрымка царскага ўрада і барацьба з левымі ідэямі.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. От Святейшего Правительствающего Синода о борьбе с пьянством в народе // Гродненские епархиальные Ведомости. – 1909. – 26 июля. – С. 301–302.

2. *Афанасьев, А. Л.* Трезвенное движение в России в период мирного развития. 1907–1914 годы: опыт оздоровления общества / А. Л. Афанасьев // Твереза література. – URL: http://www.literatura.tvereza.info/01/Afanasiev/td1907-1914.html (дата обращения: 20.04.2025).

3. Могилёвские епархиальные ведомости. – 1912. – № 4.

4. Устав Могилёвского общества трезвости, состоящего при Могилёвском церковном православном Богоявленском братстве // Могилёвские епархиальные ведомости. – 1913. – № 19. – С. 290–296.

5. *Мяньчэня, С. В.* Установы Магілёўскага павятовага папячыцельства аб народнай цвярозасці (1897–1914 гг.) / С. В. Мяньчэня // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зб. навук. прац удзельнікаў IX Міжнар. навук. канф., 25–26 чэрв. 2015 г., г. Магілёў / уклад. А. М. Бацюкоў, І. А. Пушкін. – Магілёў: МДУХ, 2015. – С. 124–130.

6. Нормальный устав приходского общества трезвости в Могилёвской епархии // Могилёвские епархиальные ведомости. – 1913. – № 22. – С. 328–333.

7. Могилёвские епархиальные ведомости. – 1913. – № 20.

8. Могилёвские епархиальные ведомости. – 1913. – № 23.

9. Могилёвские епархиальные ведомости. – 1913. – № 24.

10. Могилёвские епархиальные ведомости. – 1914. – № 3.

11. Могилёвские епархиальные ведомости. – 1914. – № 10.

12. Могилёвские епархиальные ведомости. – 1914. – № 12.

13. *Бородин, Д. Н.* В защиту трезвости (по поводу домогательств пивоваров и виноделов) / Д. Н. Бородин. – Петроград, 1915. – 25 с.

14. Переживаемый нами великий исторический момент // Могилёвские епархиальные ведомости. – 1914. – № 18. – С. 506–508.

15. М. Трезвенное дело в Могилёвской епархии // Могилёвские епархиальные ведомости. – 1915. – № 5. – С. 135–139.